УДК 811.161.3
DOI: https://doi.org/10.31499/2415-8828.1.2020.204126

# НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНЫ КАМПАНЕНТ У СКЛАДЗЕ ЎЛАСНА БЕЛАРУСКІХ ПРЫКАЗАК*

***Юлія Петрушэўская***
*магістр філалагічных навук, старшы выкладчык кафедры тэарэтычнай і прыкладной лінгвістыкі Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова*
*(Магілёў, Рэспубліка Беларусь)*
*e-mail: ypetrushevskaya@inbox.ru*
*ORCID 0000-0001-8142-294X*

*У артыкуле вызначаецца і апісваецца нацыянальна-культурны кампанент у складзе ўласна беларускіх прыказак (якія не сустракаюцца ў іншых мовах). Да паказчыкаў нацыянальна-моўнай маркіраванасці ўласна беларускіх прыказак адносяцца ўнікальныя прыказкавыя мадэлі, лексічныя і фразеалагічныя адзінкі ўласна беларускага паходжання ў складзе прыказак. Да паказчыкаў нацыянальна-культурнай маркіраванасці ўласна беларускіх прыказак адносяцца нацыянальныя (спецыфічныя) прыказкавыя прататыпы, безэквівалентныя (у дачыненні да рускай мовы) лексічныя адзінкі і лексічныя рэаліі ў складзе прыказак, нацыянальныя (спецыфічныя) паняцці і вобразы, адлюстраваныя ў слоўных кампанентах прыказак.*

***Ключавыя словы**: сучасная беларуская мова; парэміялогія; прыказка; нацыянальна-моўная спецыфіка; нацыянальна-культурная семантыка.*

***Petrushevskaya Julia. National and cultural component in the proper Belarusian proverbs.***

*The determination of the volume and composition of the national component in the Belarusian proverbial fund is an urgent problem of modern Belarusian linguistics.*

*The purpose of the study is to identify the national and cultural component in the proper Belarusian proverbs (which cannot be found in other languages).*

*The methodology of the study is based on the understanding of the proverb as a national unit (specific for a given language) and as a foreign unit (common for a given language and other languages), as well as on the distinction of proverbs of neutral and labeled components in terms of a nationally lingual (specific for a given language) and of a national and cultural aspect (reflecting the facts of this culture).*

*The study showed that, without exception, all Belarusian proverbs are nationally distinctive at the same time in accordance with one element of their structure (a unique model of proverbs) and one element of their content (national prototype of the proverb), which together represent the proverb as a separate linguistic symbol.*

*Indicators of the nationally lingual marking of the proper Belarusian proverbs include (except for unique proverb models) lexical and phraseological units of the proper Belarusian origin in the proverbs (respectively, about 16 % and about 3 %).*

*Indicators of national and cultural marking of Belarusian proverbs include (with the exception of national prototype proverbs), firstly, non-equivalents (in relation to the Russian language), lexical units in proverbs (about 3 %) and, secondly, lexical realities in proverbs (about 20 %), thirdly, national*

**© Петрушэўская Ю., 2020**

* Даследаванне выканана ў межах навуковага праекта «Універсальнае і нацыянальнае ў фразеалагічнай і парэміялагічнай падсістэмах беларускай мовы (у еўрапейскім моўным кантэксце)» (ДР № 20161332) падпраграмы «Беларуская мова і літаратура» Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» на 2016–2020 гг.

*concepts expressed in the verbal components of proverbs (about 11 %), and fourthly, national images conveyed in the verbal components of proverbs (about 44 %). Only about 3 % of Belarusian proverbs do not have nationally marked components.*

***Keywords:*** *modern Belarusian language; paremology; proverb; nationally lingual specificity; national and cultural semantics.*

**Уводзіны.** Адной з актуальных праблем беларускай парэміялогіі на сучасным этапе яе развіцця з'яўляецца, як адзначыў Я. Іваноў у дакладзе на XV Міжнародным з'ездзе славістаў (2013 г.), "вызначэнне агульнага (універсальнага) і спецыфічнага (нацыянальна-культурнага) кампанентаў беларускай парэміялогіі на фоне іншых славянскіх і неславянскіх моў" [Иванов 2013, с. 223].

Нацыянальна-культурная семантыка прыказак пачала мэтанакіравана даследавацца ў беларускім мовазнаўстве пасля выдання ў канцы 1990-х гг. лінгвакраназнаўчага слоўніка беларускіх моўных афарызмаў (прыказак, прымавак і крылатых выразаў) [Іванова, Іваноў 1997]. У 1990-х – пачатку 2000-х гг. таксама было ўпершыню метадалагічна абгрунтавана вывучэнне нацыянальна-культурнай семантыкі прыказак у лінгвакраіназнаўчым аспекце [Іваноў 1994; 1998] і распрацаваны метадалагічныя прынцыпы апісання нацыянальна-культурнай семантыкі сучаснай беларускай мовы як аб'екта лінгвакраіназнаўства [Іваноў 2001].

На сённяшні дзень у беларускім мовазнаўстве акрэслены метадалогія і перспектывы вывучэння ўніверсальнага і нацыянальнага ў фразеалагічным і парэміялагічным фондах беларускай мовы ў еўрапейскім моўным кантэксце [Іваноў 2016] на падставе ў розныя часы праведзеных супастаўляльных даследаванняў прыказак беларускай і рускай мовы [Венідзіктаў, Іваноў 2002; Іваноў 2003; Ivanov, Feldman 2007; Иванов, Тарасова 2008; Іваноў 2011б; Иванов 2014], польскай мовы [Іваноў 2000; 2002], англійскай мовы [Цеплякова 2009а; Иванов, Петрушевская 2011; Зверева, Иванов, Петрушевская 2016], нямецкай мовы [Басава 2005; Иванов, Романова 2006; Цеплякова 2009б; Вальтер, Иванов, Мокиенко 2015], іншых славянскіх і неславянскіх моў [Венідзіктаў 2003; Биндасова и др. 2008; Цеплякова 2009в; Іваноў 2009; Цеплякова, Іванова 2010а; 2010б; Іваноў 2013; 2014], а таксама падрыхтаваных беларуска-іншамоўных парэміялагічных слоўнікаў [Иванов 2001а; 2001б; Іваноў, Раманава 2006; Иванов, Мокиенко 2007; Іваноў, Іванова 2007; Англа-беларускі 2009], тлумачальных слоўнікаў беларускіх устойлівых выразаў і афарызмаў з іншамоўных крыніц [Венідзіктаў і інш. 2004; 2006; Іваноў 2011а], полілінгвальных слоўнікаў прыказак [Proverbia et dicta 1993], фразеалагічных адзінак [Мудрость слова 2015], устойлівых выразаў і афарызмаў з тэкставых крыніц [Лепта 2014; 2019а; 2019б] і інш.

Аднак спецыяльных даследаванняў, прысвечаных вызначэнню аб'ёму і складу нацыянальнага кампанента на матэрыяле ўласна беларускіх адзінак прыказкавага фонду беларускай мовы, не праводзілася.

**Мэта даследавання** – вызначыць нацыянальна-культурны кампанент у складзе ўласна беларускіх прыказак (якія не сустракаюцца ў іншых мовах).

**Метадалагічная аснова даследавання** грунтуецца на разуменні прыказкі як нацыянальнай адзінкі (спецыфічнай для дадзенай мовы) і як адзінкі іншанацыянальнай (агульнай для дадзенай мовы і іншых моў), а таксама на размежаванні ў складзе прыказак нейтральных і маркіраваных кампанентаў у

нацыянальна-моўным плане (спецыфічных для дадзенай мовы) і ў нацыянальна-культурным аспекце (што адлюстроўваюць факты дадзенай нацыянальнай культуры). У выніку папярэдніх даследаванняў намі былі вызначаны прынцыпы і акрэслены крытэрыі вызначэння нацыянальна спецыфічных прыказкавых адзінак і нацыянальна маркіраваных кампанентаў у складзе адзінак парэміялагічнага фонду беларускай мовы [Петрушевская 2014; Петрушэўская 2017; 2018а; 2018б; 2019].

Вельмі важным для акрэслення нацыянальнай адметнасці прыказак з'яўляецца моўны матэрыял, які выкарыстоўваецца даследчыкам. У выніку папярэдніх даследаванняў намі былі вызначаны прынцыпы і акрэслены крытэрыі дыферэнцыяцыі парэміялагічнага фонду беларускай мовы ў сувязі з вызначэннем яе нацыянальнага кампанента [Петрушэўская 2015]. Найбольш рэпрэзентатыўным моўным матэрыялам мэтазгодна абраць, па-першае, адзінкі прыказкавага мінімуму сучаснай беларускай мовы [Котова 2000; 2004; Ivanov 2002; Іваноў 2004; 2017, с. 99–105], па-другое, адзінкі асноўнага прыказкавага фонду беларускай мовы [Ivanov 2002; Іваноў 2006а; 2006б; 2017, с. 85–98], і па-трэцяе, адзінкі прыказкавага фонду сучаснай беларускай літаратурнай мовы, якія адлюстраваны ў тлумачальным слоўніку прыказак [Лепешаў, Якалцэвіч 2011].

**1. Нацыянальная адметнасць уласна беларускіх прыказак як цэласных моўных знакаў.** На першы погляд, можна сцвярджаць, што ўсе прыказкі, якія не маюць аналагаў у іншых мовах і складаюць нацыянальны (спецыфічны) кампанент парэміялагічнага фонду мовы, з'яўляюцца па структуры і зместу нацыянальна адметнымі (маркіраванымі).

Аднак сярод такіх прыказак сустракаюцца адзінкі, у якіх даволі цяжка адшукаць адзнакі нацыянальнай культуры, увогуле нейкую нацыянальную спецыфічнасць, як нацыянальна-культурную, так і нацыянальна-моўную, напр.: *Адкуль сіраце бацьку ўзяць*; *Без смеху якая пацеха*; *Бярэ не сіла, а смеласць*; ***Не бойся смерці, бойся старасці***; Не было б тое, было б што другое; ***Няшчасце людзей лучыць***; *Працу палюбіш – чалавекам станеш*; *У кожнага свая галава на плячах* і да т. п.

Можна меркаваць, што ў прыказках такога кшталту адлюстраваны толькі агульначалавечыя каштоўнасці, цалкам нейтральны ў адносінах да этнакультурнай спецыфікі жыццёвы вопыт, агульны для ўсіх здаровы сэнс. Асобныя элементы структуры і зместу такія прыказак могуць мець аналагі ў іншых мовах. Так, напрыклад, *У кожнага свая галава на плячах* мае ў сваім складзе фразеалагізм *<ёсць> <свая> галава на плячах*, які, у сваю чаргу, мае адпаведнік у рускай мове *<своя> голова на плечах*. У іншых мовах могуць ужывацца свабодныя (не ўстойлівыя) аналагі такіх прыказак. Так, у сучаснай рускай мове можна сустрэць ужыванне вытворнага ад фразеалагізма *своя голова на плечах* выслоўя У *каждого своя голова на плечах*, напр.: *Нельзя быть всюду затычкой, не лезть ни к кому со своими советами, у каждого своя голова на плечах, и мое мнение вовсе не требуется ... (Л. Р. Кабо, "Ровесники Октября")* і г. д. Аднак, у прыказкавых фондах іншых моў аналагі такіх прыказак не сустракаюцца. Так, выслоўе руск. У *каждого своя голова на плечах* у Нацыянальным моўным корпусе рускай мовы мае толькі 6 прыкладаў ужывання, з якіх 2 у асноўным корпусе і 4 у газетным (http://ruscorpora.ru, запрос 01.01.2020 г.). Гэта выслоўе не зафіксавана ў ніводным даведніку рускіх прыказак, хоць у зборніку У. Даля (1862) сустракаецца шэраг блізкіх прыказак (што змяшчаюь у сваім складзе фразеалагізм *<своя> голова на плечах*), напр.:

*Одна (Дорога) голова на плечах*; *Для счету и у нас голова на плечах*; *Не для шапки только голова на плечах*; *Была бы голова на плечах, а хлеб будет* і г. д.

Той факт, што ў іншых мовах няма (не зафіксавана ў парэміялагічных даведніках) прыказкавых аналагаў адзінкам, якія не маюць вонкавых адзнак нацыянальнай спецыфічнасці, дазваляе сцвярджаць, што такія прыказкі самі па сабе, як цэласныя моўныя знакі з'яўляюцца нацыянальна спецыфічнымі, г.зн. маюць нацыянальна спецыфічную (рэалізаваную ў форме ўстойлівай фразы менавіта ў дадзенай мове) структурную мадэль і нацыянальна спецыфічны (актуалізаваны як частка нацыянальнай парэміялагічнай карціны свету менавіта ў дадзенай мове) прыказкавы прататып. Пры гэтым у іншых мовах могуць сустракацца блізкія па форме, але адрозныя па структурна-семантычнай мадэлі прыказкі, напр.: *Бярэ не сіла, а смеласць* – параўн. руск. *Не силой борются (берут), уменьем*, *Не силой борются, а сноровкой (а уменьем)*, у якіх прататып, відаць, звязаны з барацьбой як спаборніцтвам (дзе важна проціпастаўленне "сила vs. умение / сноровка"), тады як у беларускай прыказцы іншы, больш агульны прататып, заснаваны на параўнанні перавагі фізічных або духоўных якасцяў чалавека (проціпастаўленне "сіла vs. смеласць").

Такім чынам, усе без выключэння прыказкі, што ўваходзяць у склад нацыянальнага (спецыфічнага) кампанента парэміялагічнага фонду мовы, з'яўляюцца нацыянальна адметнымі (маркіраванымі) адначасова паводле аднаго элемента сваёй структуры (унікальнай прыказкавай мадэлі) і аднаго элемента свайго зместу (нацыянальнага прыказкавага прататыпа), якія разам рэпрэзентуюць прыказку як асобны моўны знак. Нацыянальная адметнасць (маркіраванасць) гэтых элементаў структуры і зместу прыказкі прама і непасрэдна дэтэрмінавана прыналежнасцю гэтай прыказкі да нацыянальнага (спецыфічнага) кампанента парэміялагічнага фонду мовы і можа быць устаноўлена толькі на фоне іншых моў (шляхам аднабаковай сінхранічнай праекцыі на іншамоўныя прыказкі ў межах вызначаных парэміялагічных крыніц), што цалкам адпавядае супастаўляльнаму падыходу да разумення нацыянальнай спецыфікі моўных адзінак [Баранов, Добровольский 2008, с. 251–271].

Трэба заўважыць, што ў адрозненне ад іншых структурных і зместавых паказчыкаў нацыянальнай адметнасці (маркіраванасці) прыказкавых адзінак нацыянальнага (спецыфічнага) кампанента парэміялагічнага фонду мовы ўнікальная прыказкавая мадэль і нацыянальны прыказкавы прататып – гэта непадзельныя паказчыкі, яны рэалізуюцца толькі разам, паколькі ў межах структурнай мадэлі прыказкі вылучаюцца ключавыя словы, якія азначаюць асноўныя паняцці і вобразы ў межах прыказкавага прататыпа. А менавіта ключавыя словы і іх літаральныя і вобразныя значэнні выкарыстоўваюцца пры пошуку, ідэнтыфікацыі і верыфікацыі іншамоўных аналагаў беларускім прыказкам (шляхам аднабаковай сінхранічнай праекцыі ў кірунку ад беларускай мовы да іншых моў), на падставе чаго вызначаюцца нацыянальна спецыфічныя прыказкі (аналагі якіх адсутнічаюць у іншых мовах). Напр.: *Чалавека вочы водзяць* кваліфікавана як нацыянальна спецыфічная прыказка, паколькі ні ў якой іншай мове (паводле вызначаных іншамоўных парэміялагічных крыніц) не зафіксавана прыказак, што маюць структурна-семантычную прыказкавую мадэль "Object (чалавек) Subject (вочы) Verb (вадзіць)" ва ўсіх яе фармальных варыянтах (SVO, SOV і г.д.).

Зыходзячы з таго, што нацыянальна адметнымі (маркіраванымі) можна лічыць прыказкі пры наяўнасці нацыянальнай адметнасці (маркіраванасці) хоць бы аднаго элемента іх структуры ці зместу, усе без выключэння адзінкі нацыянальнага (спецыфічнага) кампанента парэміялагічнага фонду мовы з'яўляюцца нацыянальна адметнымі (маркіраванымі), але толькі паводле двух паказчыкаў, па-першае, унікальнай прыказкавай мадэлі (нацыянальна-моўная адметнасць), і па-другое, нацыянальнага прыказкавага прататыпа (нацыянальна-культурная адметнасць).

Паводле іншых паказчыкаў нацыянальна-моўнай ці нацыянальна-культурнай адметнасці адзінкі нацыянальнага (спецыфічнага) кампанента парэміялагічнага фонду мовы могуць быць або ўвогуле на маркіраваны (гл. вышэй), або маркіраваны ў рознай ступені.

**2. Нацыянальна-моўная маркіраванасць уласна беларускіх прыказак.** Да паказчыкаў нацыянальна-моўнай адметнасці (маркіраванасці) адзінак нацыянальнага (спецыфічнага) кампанента парэміялагічнага фонду мовы адносяцца, акрамя ўнікальных прыказкавых мадэляў (гл. вышэй), па-першае, лексічныя адзінкі ўласна беларускага паходжання ў складзе прыказак, па-другое, фразеалагічныя адзінкі ўласна беларускага паходжання ў складзе прыказак.

Лексічныя адзінкі ўласна беларускага паходжання ў складзе прыказак размяжоўваюцца на ўзуальныя (дыялектныя, размоўныя, прастамоўныя) і аказіянальныя (прыказкавыя наватворы). Напр.: *З грамаці хлеба не гамаці* (дзе ўжываецца дыялектнае *грамаць* 'грамата' і размоўнае *гамаць* 'есці'); *Мужык з жонкай сварыцца, калі трасца ў гаршку варыцца* (дзе ўжываецца размоўнае *трасца* ў пераносным сэнсе з адмоўным адценнем 'нічога няма'); *Дзе прыбытак чуюць, там памагачы начуюць* (дзе ўжываецца *памагачы* – прыказкавы наватвор ад *памагаты* 'прыслужнік, гатовы на любыя дзеянні, учынкі') і да т.п.

Фразеалагічныя адзінкі ўласна беларускага паходжання ў складзе прыказак таксама размяжоўваюцца на ўзуальныя (найчасцей размоўныя) і аказіянальныя (прыказкавыя наватворы), напр.: *<А> калі што якое, дык <і> што там (тут) такое* (дзе ўжываецца размоўнае *калі, як што якое* ў значэнні безасабовага выказніка даданага сказа '(калі) узнікнуць якія-небудзь цяжкасці, здарыцца што-небудзь'); *Еш хоць расперажыся, але (толькі) і працаваць не ляніся* (дзе ўжываецца *хоць расперажыся* 'уволю, колькі хочаш'); *Тады маці міла, як ногі мыла* (дзе ўжываецца *ногі мыць (каму, чые)* як прыказкавы наватвор ад *ногі мыць (каму, чые) і тую ваду піць*, запазычанага з рускай мовы, 'бязмежна дагаджаць каму-н. у знак удзячнасці за што-н.') і да т.п.

Лексічных адзінак уласна беларускага паходжання ўжываецца ў пяць разоў больш за колькасць фразеалагізмаў уласна беларускага паходжання (адпаведна, больш за 15 % і каля 3 %). Колькасныя суадносіны паказчыкаў нацыянальна-моўнай маркіраванасці ўласна беларускіх (спецыфічных) адзінак парэміялагічнага фонду беларускай мовы адлюстраваны ў табліцы.

| | Маркіраваныя прыказкі | Нейтральныя прыказкі |
|---|---|---|
| Унікальныя прыказкавыя мадэлі | 100 % | 0 % |
| Лексічныя адзінкі ўласна беларускага паходжання ў складзе прыказак | 15,72 % | 84,28 % |
| Фразеалагічныя адзінкі ўласна беларускага паходжання ў складзе прыказак | 2,68 % | 97,32 % |

**3. Нацыянальна-культурная маркіраванасць уласна беларускіх прыказак.** Да паказчыкаў нацыянальна-культурнай адметнасці (маркіраванасці) адзінак нацыянальнага (спецыфічнага) кампанента парэміялагічнага фонду мовы адносяцца, акрамя нацыянальных прыказкавых прататыпаў (гл. вышэй), па-першае, безэквівалентныя лексічныя адзінкі ў складзе прыказак (у дачыненні да рускай мовы), па-другое, рэаліі (лексічныя) у складзе прыказак, па-трэцяе, нацыянальныя паняцці, адюстраваныя ў слоўных кампанентах прыказак, па-чацвёртае, нацыянальныя вобразы, адюстраваныя ў слоўных кампанентах прыказак.

Безэквівалентная лексіка (без уліку рэалій) даволі рэдка сустракаецца ў складзе адзінак нацыянальнага (спецыфічнага) кампанента парэміялагічнага фонду беларускай мовы (у каля 3 % ад агульнай колькасці прыказак), што можна патлумачыць моўным матэрыялам, адабраным для даследавання (найперш, адсутнасцю дыялектных прыказак, а таксама высокім узроўнем вядомасці і ўжывальнасці прыказак, якія ў гэтым выпадку павінны быць зразумелы ўсім носьбітам беларускай мовы, што амаль усе з'яўляюцца беларуска-рускімі білінгвамі і ў сваёй большасці інтуітыўна імкнуцца да памяншэння адрозненняў паміж мовамі, якімі карыстаюцца, што вядзе ў выбары прыказак для ўжывання ў маўленні да перавагі адзінак з як мага меншымі цяжкасцямі пры іх перадачы на іншай мове камунікацыі – рускай). Напр.: *Ад жыгучкі трымай далей ручкі* (дзе ўжываецца безэквівалентнае *жыгучка* 'жгучая крапіва'); *Хоць не ўежна, але ўлежна* (дзе ўжываецца безэквівалентнае *ўлежна* як прыказкавы наватвор ад *улежаны* 'які стаў прыдатным да ўжытку ў выніку працяглага захоўвання (пра садавіну, гародніну)') і да т. п.

Рэаліі лексічныя значна часцей сустракаюцца ў адзінках нацыянальнага (спецыфічнага) кампанента парэміялагічнага фонду беларускай мовы (у каля 20 % ад агульнай колькасці прыказак), напр.: *Пазнаюць нашу дачку і ў андарачку* (дзе ўжываецца рэалія *андарак* 'саматканая паласатая або ў клетку спадніца' – паясное адзенне беларускай жанчыны – спадніца з шарсцяной ці паўшарсцяной саматканкі ў клетку або ў падоўжаныя ці папярочныя палосы); *Што кажух, то не вата, <а> што капуста, то не гарбата* (дзе ўжываецца рэалія капуста 'традыцыйная беларуская страва з варанай дробна пакрышанай капусты з бульбай, прыправамі, часам з грыбамі, якую гатуюць з мясам або затаўкаюць здорам ці засквараюць; часта перад ядою прыпраўляюць смятанай') і да т. п.

Нацыянальныя паняцці, што адлюстраваны ў слоўных кампанентах адзінак нацыянальнага (спецыфічнага) кампанента парэміялагічнага фонду беларускай мовы, з'яўляюцца часткай нацыянальнай прыказкавай карціны свету, вынікам яскрава нацыянальна спецыфічнага ўспрымання і асэнсавання рэчаіснасці (хоць, праўда, і могуць мець аналагі ў іншых лінгвакультурах, але не ў межах прыказак ці ў процілеглым сэнсе). Напр.: *Абы сына прычакаць, а імя можна падшукаць*, дзе ўжываецца кампанент *сын*, значэнне якога, зыходзячы з умоў жыцця сялян, можна патлумачыць як 'памочнік, што застанецца, як вырасце, дома ў адрозненне ад дачкі, якая пойдзе замуж у іншую гаспадарку памочніцай' (у прыказцы *сын* выкарыстоўваецца для азначэння паняцця 'памочнік у сялянскай гаспадарцы'), параўн. процілеглае руск. *Не в рабы, а в помощницы "(благословляя, говорит отец дочери)"*. Або: *Хвароба – мігрэнь: жраць ахвота, а працаваць лень*, дзе назва "панскай", як лічылася ў народзе, хваробы *мігрэнь* ужываецца для азначэння паняцця 'лень'. Або: *Хмель*

*не вада – чалавеку бяда*, дзе ўжываецца кампанент *хмель* для адлюстравання паняцця ‘алкагольны напой’, або ‘хмельны напітак’, параўн. у рускіх прыказках хмель як ‘стан ап’янення’ (*Дурацкую голову и хмель не берет*) ці як ‘п’янства’ (*Работа денежку копит, хмель денежку топит*). Або: *Што кажух, то не вата, <а> што капуста, то не гарбата*, дзе ўжываецца назоўнік *вата* ў пераносным сэнсе для азначэння паняцця ‘паліто (увогуле верхняе адзенне) на ваце’ (*вата* ў прамым значэнні – ‘пушысты, валакністы матэрыял, звычайна з бавоўны’, што шырока выкарыстоўваецца ў вытворчасці верхняга адзення); у прыказцы проціпастаўляюцца сялянскі *кажух* і гарадское паліто – *вата*, простая ежа *капуста* вытанчанай *гарбаце* (як проціпастаўленне рознага тыпу рэчаў і людзей) і да т.п. Нацыянальныя паняцці сустракаюцца ў плане зместу амаль кожнай дзясятай з нацыянальных (спецыфічных) прыказак.

Нацыянальныя вобразы, што адлюстраваны ў слоўных кампанентах адзінак нацыянальнага (спецыфічнага) кампанента парэміялагічнага фонду беларускай мовы, з’яўляюцца, як і нацыянальныя паняцці, арганічнай часткай нацыянальнай прыказкавай карціны свету, вынікам нацыянальна спецыфічнага ўспрымання і асэнсавання рэчаіснасці (звычайна не маюць аналагаў у іншых лінгвакультурах у межах прыказак). Напр.: *Чырвонае – белае ўсё перадзелае*, дзе ўжываецца слоўны комплекс *чырвонае – белае* як вобразнае азначэнне хабару, паколькі ў XIX стагоддзі, калі ўзнікла прыказка, папяровыя грошы адрозніваліся па колеры, які часта прама асацыяваўся з наміналам адпаведных банкнотаў – дзесяць рублёў былі чырвонага колеру, а дваццаць пяць рублёў – белага (хабар, звычайна, і давалі менавіта гэтымі банкнотамі, якія былі найбольш распаўсюджанымі пры сярэдніх па аб’ёме разліках паміж фізічнымі асобамі). Або: *Бачаннем не зловіш жураўля*, дзе выкарыстоўваецца вобраз *жураўля*, які ў вераваннях беларусаў у многім пераклікаецца з вобразам бусла, яднае іх перадусім вонкавае падабенства, а таксама ўспрыманне як птушак іншасвету ў яго станоўчым разуменні, паколькі беларусы здаўна лічылі жураўля і бусла носьбітамі дабрабыту. Або: *Добрае карэнне, добрае і насенне*, дзе *карэнне* і *насенне* ўжываюцца для вобразнага азначэння ‘бацькоў’ і іх ‘дзяцей’ (параўн. прыказку *Якое карэнне, такое і насенне* ‘Дзеці пераймаюць асноўныя рысы ў бацькоў’). Або: *Гадуй, мядзведзь, дзеці, каб было за кім сядзеці*, дзе выкарыстоўваецца вобраз *мядзведзя*, які з’яўляецца адным з найбольш папулярных персанажаў беларускай народнай міфалогіі, у дадзеным выпадку актуалізуецца пашыраны ў фальклоры і міфалогіі беларусаў матыў пра паходжанне мядзведзя ад чалавека (парада ў прыказцы *гадаваць дзеці* даецца на прыкладзе мядзведзя, таму што ён у даўнія часы лічыўся сваяком чалавеку, быў татэмнай жывёлай, продкі беларусаў верылі, што некалі ў мядзведзя быў ператвораны чалавек: яго лапы – як чалавечыя рукі; ён ходзіць на дзвюх нагах, мыецца, любіць мёд і гарэлку, клапоціцца аб сваіх дзецях, разумее чалавечую мову і нават смокча лапу, як дзіця”) і да т.п. Нацыянальныя вобразы выкарыстоўваюцца ў амаль палове ад агульнай колькасці ўсіх нацыянальных (спецыфічных) прыказак.

Колькасныя суадносіны ўсіх паказчыкаў нацыянальна-культурнай маркіраванасці ўласна беларускіх (спецыфічных) адзінак парэміялагічнага фонду беларускай мовы адлюстраваны ў табліцы.

| | Маркіраваныя прыказкі | Нейтральныя прыказкі |
|---|---|---|
| Нацыянальныя прыказкавыя прататыпы | 100 % | 0 % |

| | | |
|---|---|---|
| Безэквівалентныя лексічныя адзінкі ў складзе прыказак | 3,01 % | 96,99 % |
| Рэаліі (лексічныя) у складзе прыказак | 19,73 % | 80,27 % |
| Нацыянальныя паняцці, адюстраваныя ў слоўных кампанентах прыказак | 10,37 % | 89,63 % |
| Нацыянальныя вобразы, адюстраваныя ў слоўных кампанентах прыказак | 43,49 % | 56,51 % |

**Заключэнне.** Усе прыказкі, якія не маюць аналагаў у іншых мовах, складаюць уласна беларускую (спецыфічную) частку парэміялагічнага фонду беларускай мовы. Такія прыказкі з'яўляюцца нацыянальна спецыфічнымі самі па сабе, як моўныя знакі, г.зн. маюць спецыфічную (рэалізаваную ў форме ўстойлівай фразы менавіта ў дадзенай мове) структурную мадэль і спецыфічны (актуалізаваны як частка нацыянальнай парэміялагічнай карціны свету менавіта ў дадзенай мове) прыказкавы прататып. Усе без выключэння ўласна беларускія прыказкі з'яўляюцца нацыянальна адметнымі адначасова паводле аднаго элемента сваёй структуры (унікальнай прыказкавай мадэлі) і аднаго элемента свайго зместу (нацыянальнага прыказкавага прататыпа), якія разам рэпрэзентуюць прыказку як асобны моўны знак.

Да паказчыкаў нацыянальна-моўнай маркіраванасці ўласна беларускіх адзінак парэміялагічнага фонду беларускай мовы адносяцца, акрамя ўнікальных прыказкавых мадэляў (100 %), па-першае, лексічныя адзінкі ўласна беларускага паходжання ў складзе прыказак (15,72 %), па-другое, фразеалагічныя адзінкі ўласна беларускага паходжання ў складзе прыказак (2,68 %). Да паказчыкаў нацыянальна-культурнай маркіраванасці ўласна беларускіх адзінак парэміялагічнага фонду беларускай мовы адносяцца, акрамя нацыянальных прыказкавых прататыпаў (100 %), па-першае, безэквівалентныя (у дачыненні да рускай мовы), лексічныя адзінкі ў складзе прыказак (3,01 %), па-другое, лексічныя рэаліі ў складзе прыказак (19,73 %), па-трэцяе, нацыянальныя паняцці, адюстраваныя ў слоўных кампанентах прыказак (10,37 %), па-чацвёртае, нацыянальныя вобразы, адюстраваныя ў слоўных кампанентах прыказак (43,49 %).

## ЛІТАРАТУРА

*Англа-беларускі парэміялагічны слоўнік = English-Belarusian Paremiological Dictionary* (2009). Іваноў Я. Я. (рэд.). Магілёў, 240 с.

Балакова, Д., Вальтер, Х., Венжинович, Н. Ф., Гутовская, М. С., Иванов, Е. Е. и Мокиенко, В. М. (2014). *Лепта библейской мудрости: библейские крылатые выражения и афоризмы на русском, английском, белорусском, немецком, словацком и украинском языках* : словарь. Могилев, 208 с.

Баранов, А. Н. и Добровольский, Д. О. (2008). *Аспекты теории фразеологии*. Москва, 656 с.

Басава, Г. У. (2005). Лінгвістычныя і экстралінгвістычныя адрозненні эквівалентных беларускіх і нямецкіх прыказак. [У:] *Славянская фразеология в ареальном, историческом и этнокультурном аспектах*. Гомель, с. 85–88.

Биндасова, О. Ю., Иванова, С. Ф. и Филимонова, И. Ю. (2008). Лексико-грамматическая организация французских и белорусских пословиц (сравнительный анализ). [In:] *Даследаванні па германскай і славянскай філалогіі = Acta Germano-Slavica*, вып. 2, с. 144–159.

Вальтер, Х., Иванов, Е. Е. и Мокиенко, В. М. (2015). Белорусские пословицы в контексте европейской паремиологии (о русско-немецко-белорусском словаре пословиц с иноязычными параллелями). [В:] *Актуальныя праблемы філалогіі і методыкі выкладання філалагічных дысцыплін*. Магілёў, с. 209–214.

Венідзіктаў, С. В. (2003). Іншамоўныя крылатыя выразы ў сучаснай беларускай мове. [In:] *Studia sławistyczne*, t. 4, s. 121–130.

Венідзіктаў, С. В. і Іваноў, Я. Я. (2002). Рускамоўныя запазычанні крылатых слоў у сучаснай беларускай мове. [In:] *Dziedzictwo przeszłości związków językowych, literackich i kulturowych polsko-bałto-wschodniosłowiańskich*. Białystok, t. VIII, s. 210–217.

Венідзіктаў, С. В., Даніленка, І. Л., Іванова, С. Ф. і Іваноў, Я. Я. (2004). *Крылатыя выразы ў беларускай мове. Ч. 1. З іншамоўных (еўрапейскіх і амерыканскіх) крыніц XII–XX стст* : тлумачальны слоўнік. Іваноў Я. Я. (рэд.). Магілёў, 136 с.

Венідзіктаў, С. В., Даніленка, І. Л., Іванова, С. Ф., Іваноў, Я. Я. і Чэх, В. В. (2006). *Крылатыя выразы ў беларускай мове. Ч. 2. З рускамоўных літаратурных і фальклорных крыніц XII–XX стст.* : тлумачальны слоўнік. Магілёў, 208 с.

Зверева, Ю. С., Иванов, Е. Е. и Шестернёва, А. Н. (2016). Сравнительная типология фразеологии английского и белорусского языков (актуальность, методология, перспективы исследования). [В:] *Восточнославянские языки и литературы в европейском контексте – 2015*. Могилев, с. 164–168.

Иванов, Е. Е. (2001а). *Русско-белорусский словарь пословиц = Руска-беларускі слоўнік прыказак: 777 пословиц русского языка, свыше 5000 белорусских паремиологических эквивалентов и соответствий*. В 2 ч. Могилев, ч. 1, 144 с.

Иванов, Е. Е. (2001б). *Русско-белорусский словарь пословиц = Руска-беларускі слоўнік прыказак: 777 пословиц русского языка, свыше 5000 белорусских паремиологических эквивалентов и соответствий*. В 2 ч. Могилев, ч. 2, 164 с.

Иванов, Е. Е. (2013). Белорусская паремиология и афористика в общеевропейском контексте (актуальные проблемы изучения). [У:] *XV Міжнародны з'езд славістаў = XV Международный съезд славистов = XV International Congress of Slavists, г. Мінск, Беларусь, 20–27 жніўня 2013 г.* : тэзісы дакладаў. Лукашанец А. А. (рэд.). Мінск, т. 1, с. 322–323.

Иванов, Е. Е. (2014). Парадоксальные пословицы в русском и белорусском языках. [В:] *Вестник Новгородского государственного университета*, серия “Филологические науки”, № 77, с. 21–24.

Иванов, Е. Е. и Мокиенко, В. М. (2007). *Русско-белорусский паремиологический словарь*. Могилев, 242 с.

Иванов, Е. Е. и Петрушевская, Ю. А. (2011). Различия в семантике и структуре белорусских и английских пословиц. [В:] *Актуальные проблемы преподавания иностранных языков в высшей школе Республики Беларусь*. Могилев, с. 213–215.

Иванов, Е. Е. и Романова, Н. К. (2006). Типы межъязыковых сходств и различий паремиологических единиц (на материале белорусского и немецкого языков). [In:] *Acta Albaruthenica, Rossica, Polonica VII*. Віцебск, с. 161–164.

Иванов, Е. Е. и Тарасова, М. В. (2008). Семантические типы русских и белорусских пословиц. [In:] *Даследаванні па германскай і славянскай філалогіі = Acta Germano-Slavica*, вып. 2, с. 188–212.

Іванова, С. і Іваноў, Я. (1997). *Слоўнік беларускіх прыказак, прымавак і крылатых выразаў*. Мінск, 262 с.

Іваноў, Я. (1998). Нацыянальна-культурная семантыка беларускай мовы і праблема яе лінгвакраіназнаўчай рэпрэзентацыі (на матэрыяле моўнай афарыстыкі). [У:] *Сацыякультурная прастора мовы (сацыяльныя і культурныя аспекты вывучэння беларускай мовы)*. Мінск, с. 33–62.

Іваноў, Я. (2001). Нацыянальна-культурная семантыка беларускай мовы як аб'ект лінгвакраіназнаўства (пры вывучэнні беларускай мовы як замежнай і як другой ва ўмовах блізкароднаснага руска-беларускага білінгвізму). [У:] *Беларуская мова: шляхі развіцця, кантакты, перспектывы*. Цыхун Г. А. (рэд.). Мінск, с. 285–290.

Іваноў, Я. Я. (1994). Нацыянальна-культурная семантыка беларускай моўнай афарыстыкі (лінгвакраіназнаўчы аспект). [В:] *Национально-культурный компонент в тексте и в языке*. Минск, ч. 2, с. 55–57.

Іваноў, Я. Я. (2000). Польска-беларускія парэміялагічныя паралелі. [In:] *Dziedzictwo przeszłości związków językowych, literackich i kulturowych polsko-bałto-wschodniosłowiańskich*. Białystok, t. III, s. 33–54.

Іваноў, Я. Я. (2002). Параўнальны аналіз беларускіх і польскіх прыказак і нацыянальна-культурная семантыка беларускай мовы (лінгвакраіназнаўчы аспект). [In:] *Polsko-białoruskie związki językowe, literackie, historyczne i kulturowe = Польска-беларускія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі*. Białystok, s. 117–126.

Іваноў, Я. Я. (2003). Прынцыпы супастаўляльнага апісання афарыстычнай парэміялогіі беларускай і рускай моў. [In:] *Studia sławistyczne*, t. 4, s. 49–55.

Іваноў, Я. Я. (2004). Сацыялінгвістычныя параметры беларускіх прыказак (да праблемы вызначэння парэміялагічнага мінімуму і асноўнага парэміялагічнага фонду сучаснай беларускай літаратурнай мовы). [У:] *Мова і соцыум*. Магілёў, с. 201–224.

Іваноў, Я. Я. (2006а). Да праблемы вызначэння асноўнага парэміялагічнага фонду беларускай мовы. [У:] *Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*, серыя 4, № 3, с. 103–109.

Іваноў, Я. Я. (2006б). Асноўны парэміялагічны фонд беларускай мовы і "Proverbiorum polonicorum" (1618) С. Рысіньскага. [У:] *Паланістыка – Полонистика – Polonistyka 2006*. Мінск, с. 79–94.

Іваноў, Я. Я. (2009). Параўнальнае мовазнаўства і нацыянальна-культурная семантыка мовы (на матэрыяле парэміялагічных адзінак). [У:] *Нацыянальная мова і нацыянальная культура: аспекты ўзаемадзеяння*. Мінск, с. 54–57.

Іваноў, Я. Я. (2011а). *Крылатыя афарызмы ў беларускай мове: з іншамоўных літаратурных і фальклорных крыніц VIII ст. да н. э. – XX ст.* : тлумачальны слоўнік. Магілёў, 164 с.

Іваноў, Я. Я. (2011б). Парэміялагічныя сістэмы беларускай і рускай моў: падабенствы і разыходжанні. [У:] *Філологічні студії: наук. вісник Криворізького держ. пед. ун-ту*, вип. 6, ч. 2, с. 53–63.

Іваноў, Я. Я. (2013). Прыказкі і антыпрыказкі ў беларускай і іншых славянскіх і неславянскіх мовах. [У:] *Славянские народы и их культуры: традиция и современность*. Гомель, с. 137–139.

Іваноў, Я. Я. (2014). Беларускія прыказкі з біблійных крыніц (матэрыялы да руска-беларуска-англійскага слоўніка біблеізмаў). [В:] *Авраамиевские чтения*. Королькова А. В. (ред.). Смоленск, с. 11–24.

Іваноў, Я. Я. (2016). Універсальнае і нацыянальнае ў фразеалагічнай і парэміялагічнай падсістэмах беларускай мовы ў еўрапейскім моўным кантэксце (актуальнасць, метадалогія, перспектывы даследавання). [В:] *Славянская фразеология в синхронии и диахронии*, вып. 3, с. 46–49.

Іваноў, Я. Я. (2017). *Афарыстычныя адзінкі ў беларускай мове*. Магілёў, 208 с.

Іваноў, Я. Я. і Іванова, С. Ф. (2007). *Польска-беларускі парэміялагічны слоўнік = Polsko-białoruski słownik paremiologiczny*. Магілёў, 192 с.

Іваноў, Я. Я. і Раманава, Н. К. (2006). *Беларуска-нямецкі парэміялагічны слоўнік = Belarussisches-Deutsch paremiologisches Wörterbuch*. Магілёў, 108 с.

Котова, М. Ю. (2000). *Русско-славянский словарь пословиц (с английскими соответствиями)*. Санкт-Петербург, 360 с.

Котова, М. Ю. (2004). *Славянская паремиология*. Дис. … д-ра филол. наук: 10.02.01; 10.02.03. Санкт-Петербург, т. 2, 540 с.

Лепешаў, І. Я. і Якалцэвіч, М. А. (2011). *Тлумачальны слоўнік прыказак*. Гродна, 695 с.

*Лепта библейской мудрости: русско-славянский словарь библейских выражений и афоризмов с соответствиями в германских, романских и др. языках* (2019а). Иванов Е. Е., Мокиенко В. М., Балакова Д., Вальтер Х. (ред.). Могилев, т. 1, 334 с.

*Лепта библейской мудрости: русско-славянский словарь библейских выражений и афоризмов с соответствиями в германских, романских и др. языках* (2019б). Иванов Е. Е., Мокиенко В. М., Балакова Д., Вальтер Х. (ред.). Могилев, т. 2, 308 с.

*Мудрость слова сквозь века и народы: десятиязычный словарь фразеологических эквивалентов* (2015). Гончарова Н. А. (ред.). Минск, 480 с.

Петрушевская, Ю. А. (2014). Интернациональные, заимствованные и исконно языковые единицы в составе паремиологического фонда современного белорусского языка. [В:] *Вестник Новгородского государственного университета*, серия "Филологические науки", № 77, с. 123–126.

Петрушэўская, Ю. А. (2015). Паняцце парэміялагічнага фонду мовы і прынцыпы яго дыферэнцыяцыі (у сувязі з вызначэннем універсальнага і нацыянальнага кампанентаў у парэміялагічнай сістэме мовы). [У:] *Філологічний часопис*, вип. 1 (6), с. 100–106.

Петрушэўская, Ю. А. (2017). Універсальны, інтэрнацыянальны і нацыянальны кампаненты парэміялагічнага фонду сучаснай беларускай літаратурнай мовы (на матэрыяле публіцыстычных тэкстаў). [У:] *Філологічні студії : наук. вісник Криворізького держ. пед. ун-ту*, вип. 16, с. 195–201.

Петрушэўская, Ю. А. (2018а). Нацыянальная адметнасць прыказкавага фонду беларускай мовы. [В:] *Ученые записки Витебского государственного университета имени П. М. Машерова*, т. 27, с. 150–154.

Петрушэўская, Ю. А. (2018б). Да праблемы вызначэння нацыянальнай адметнасці прыказкавага фонду беларускай мовы. [У:] *Філологічний часопис*, вип. 2 (12), с. 70–75.

Петрушэўская, Ю. А. (2019). Вывучэнне нацыянальна-культурнага кампанента ў парэміялагічным фондзе беларускай мовы. [В:] *Труды БГТУ*, серия 4, Принт- и медиатехнологии, № 1 (217), с. 123–129.

Цеплякова, А. Д. (2009а). Англамоўныя запазычанні крылатых слоў у сучаснай беларускай літаратурнай мове (колькасны склад і крыніцы паходжання). [У:] *Веснік Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна*, № 2 (23), с. 162–166.

Цеплякова, А. Д. (2009б). Нямецкамоўныя запазычанні крылатых слоў у сучаснай беларускай літаратурнай мове (колькасны склад і крыніцы паходжання). [У:] *Веснік Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова*, № 1 (32), с. 137–143.

Цеплякова, А. Д. (2009в). Франкамоўныя запазычанні крылатых слоў у сучаснай беларускай літаратурнай мове (колькасны склад і крыніцы паходжання). [У:] *Веснік Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна,* серыя філалагічных навук, № 2 (12), с. 109–116.

Цеплякова, А. Д. і Іванова, С. Ф. (2010а). Лацінскія запазычанні крылатых слоў у сучаснай беларускай літаратурнай мове (колькасны склад, формы ўжывання і крыніцы паходжання). [У:] *Веснік Мазырскага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна*, № 1 (26), с. 88–93.

Цеплякова, А. Д. і Іванова, С. Ф. (2010б). Старажытнагрэчаскія запазычанні крылатых слоў у сучаснай беларускай літаратурнай мове (колькасны склад, формы ўжывання і крыніцы паходжання) [У:] *Веснік Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта*, серыя А – гуманітарныя навукі, № 7, с. 176–179.

Ivanov, E. & Feldman, V. (2007). Principles of the Contrastive Description of Aphoristic Paremiology (in Belarussian and Russian Languages). [In:] *Даследаванні па германскай і славянскай філалогіі = Acta Germano-Slavica*, вып. 1, с. 85–97.

Ivanov, E. E. (2002). *Paremiological Minimum and Basic Paremiological Stock (Belarusian and Russian).* Prague, 136 p.

*Proverbia et dicta: шасцімоўны слоўнік прыказак, прымавак і крылатых слоў* (1993). Ганчарова Н. А. (рэд.). Мінск, 255 с.

*Подано до редакції 01.04.2020 року*
*Прийнято до друку 30.04.2020 року*